Падтрымай "Вясну" на PATREON

Масавыя затрыманні на Берасцейшчыне. Хроніка пераследу 2 ліпеня

дапоўнена

02.07.2021 **Тэгі**: адміністратыўны пераслед, затрыманні

Праваабарончы цэнтр "Вясна" працягвае збіраць факты палітычнага пераследу па ўсёй краіне. 2 ліпеня адбываюцца затрыманні, ператрусы, заводзяцца новыя палітычна матываваныя крымінальныя справы, працягваецца ціск на палітвязняў. Улады ўзмацняюць розныя формы ціску і рэпрэсій на людзей за іх актыўную грамадзянскую пазіцыю.

Калі вас ці вашых блізкіх затрымалі, паведамляйце нам:

- ***праз тэлеграм-бот @viasna_bot;***
- ***на гарачую лінію у тэлеграм @ViasnaSOS, @SOSViasna***

Брэст

Сёння ў Брэсце затрымалі мінімум два чалавекі. З дому забралі **Кандрацюк Тамару**. Берасцейцы таксама бачылі, як у ІЧУ заводзяць жанчыну, яна прадставілася **Малайчык Вольгай**. Двое супрацоўнікаў вялі яе ў ізалятар, у руках у жанчыны быў сістэмны блок кампутара. Жанчыну адпусцілі ў сувязі з наяўнасцю непаўнагадовых дзяцей.

Усе затрыманыя ў Брэсце з'яўляюцца актывістамі.

Таксама праваабаронцам "Вясны" паведамілі пра затрыманне ў Брэсце **Васіля Рэчкіна, Вячаслава Яравога, Дзіяны Калішук** і яе маці **Святланы Калішук.**

Таксама вядома аб затрыманні **Зоі Грушынай, Надзеі Круц, Рамана Шабуні, Аляксандра Шарсцюка** дома ў іх адбыліся ператрусы.

У Брэсце таксама затрымалі **Ігара Ушакова**. Разам з ім была затрыманая яго дзяўчына **Яна** (прозвішча ўдакладняецца).

Як перадае "Вясна: Палітвязні Беларусі", палітвязень **Андрэй Шарэнда** пакінуў Беларусь. 28 чэрвеня ў судзе Маскоўскага раёна Брэста павінен быў пачацца працэс над грамадскім актывістам і палітвязнем Андрэем Шарэндам, які 31 траўня быў змешчаны пад хатні арышт. Але на суд ён так і не

з’явіўся, таму суддзя **Вера Філонік** абвясціла **Андрэя Шарэнду** ў вышук. Праваабаронцам стала вядома, што **Андрэй Шарэнда** пакінуў Беларусь.

Супраць Андрэя ўзбуджаны дзве крымінальныя справы: па **артыкуле 361 КК** (Заклікі да дзеянняў, якія наносяць шкоду нацыянальнай бяспецы) і па **артыкуле 368 КК** (Абраза прэзідэнта). 9 чэрвеня яго жонку **Паліну Шарэнда-Панасюк** асудзілі **на 2 гады калоніі агульнага рэжыму.** Жанчыну абвінавацілі па шэрагу артыкулаў Крымінальнага кодэксу: арт. 364, арт. 368 і арт. 369.

Пружаны

Раніцай у Пружанах былі затрыманыя мінімум трое: **Юрый Папко, Баран Ганна і Дзевенцейчык Анатоль**. Імя Анатоля нядаўна гучна прагучала ў краіне: быў выкладзены аўдыёзапіс, на якім дырэктар лясгаса (дзе працаваў мужчына) казаў пра нейкі загад аб звальненні, пракуратуры і нязгодзе з дзяржавай. Анатоля звольнілі па артыкуле, але ён спрабаваў гэта аспрэчыць у судзе (пакуль беспаспяхова). Сёння ж Анатоль збіраўся падаваць скаргу на рашэнне суда першай інстанцыі, і калі ехаў на машыне побач з судом - быў спынены супрацоўнікамі ДАІ. Далей, як паведамілі знаёмыя Анатоля, пад'ехала іншая міліцэйская машына, з якой выбеглі 4 супрацоўнікаў у масках. На дапамогу да Анатоля прыехала Баран Ганна, і іх дваіх забралі ў РАУС.

Юрыя Папко, як паведамілі "Вясне", затрымалі каля 8 раніцы, калі ён выходзіў з дома з дзіцем. Ён паспеў адвесці дзіцяці дадому, і яго забралі ў РАУС.

Таксама стала вядома аб затрыманні **Іллі Ілляшэвіча**.

Бяроза

У Бярозе, паводле інфармацыі берасцейскіх праваабаронцаў, быў ператрус дома і ў машыне ў актывіста **Вадзіма Пашкевіча**. Таксама ператрусы дома, у машыне і ў краме правялі ў мясцовага прадпрымальніка **Валянціна Сцяпкова**.

Кобрын

Таксама паведамляецца пра затрыманні ў Кобрыны, але прозвішчы затрыманых невядомыя.

Жабінка

"Белсат" паведамляе, што колькасць затрыманых у Жабінке павялічалася да шасці чалавек. Гэта: **Кулік Сяргей, Гурын Генадзь, Святлана і Вадзім Аксюцікі, Казлоў Аляксандр** і **Дырман Наталля**. Сяргей Кулік - бацька траіх дзяцей, у 7 раніцы дома ў іх правялі ператрус.

Магчыма гэта прывентыўныя затрыманні перад заўтрашнім Днём Незалежнасці.

У Кобрыне міліцыя вырашыла агледзець дом па справе аб пікеце, які яшчэ не прайшоў. Тэлеграм-канал @bnkbel апублікаваў незвычайны дакумент. Згодна з ім, "зарэгістравана ананімнае паведамленне" аб тым, што хтосьці плануе 3 ліпеня "правядзенне пікетавання з выкарыстаннем

незарэгістраванай сімволікі". Аўтары дакумента адзначаюць, што ў гэтым "угледжваецца склад правапарушэння" па артыкуле аб масавых мерапрыемствах.



УТВЕРЖДАЮ
Вриод начальника
Кобринского РОВД
подполковник милиции
А.М.Косяк
1 июля 2021 года

САНКЦИОНИРУЮ
Прокурор Кобринского
района советник юстиции
С.А.Мешечко
« » июля 2021 года

ПОСТАНОВЛЕНИЕ
о производстве осмотра

« 01 » июля 2021 года г. Кобрин

Заместитель начальника ООПП Кобринского РОВД майор милиции Войтович М.А., рассмотрев материал проверки ЕК № 6320 от 30.06.2021 года,

УСТАНОВИЛ:

30.06.2021 года в ЕК Кобринского РОВД зарегистрировано анонимное сообщение о том, что 03.07.2021 в парке им. Суворова планируют проведение пикетирования деструктивно граждане с использованием незарегистрированной символики.

В действиях деструктивно настроенных лиц усматривается состав административного правонарушения, предусмотренного ст. 24.23 КоАП Республики Беларусь.

По поступившей в Кобринский РОВД информации, гражданин [redacted] проживающий по адресу: г. Кобрин, [redacted] может быт причастен к совершению указанного административного правонарушения.

Таким образом, по адресу: г. Кобрин [redacted] могут быть обнаружены, материальные объекты, имеющие значение для дела.

На основании изложенного и руководствуясь статьей ч. 1 ст. 11.10 ПИКоАП Республики Беларусь,

ПОСТАНОВИЛ:

1. Произвести осмотр по адресу: г. Кобрин, ул [redacted] , а также иных законных владений, относящихся к данному дому.
2. Копию постановления направить прокурору Кобринского района.

Заместитель начальника ООПП
Кобринского РОВД
майор милиции М.А. Войтович

Постановление мне объявлено «___» _____ 2021 года.

_____ _____

Нейкі грамадзянін (яго імя ўтоена) "можа быць датычны да здзяйснення правапарушэння". Чаму менавіта ён? *«Па інфармацыі, якая паступіла ў Кобрынскі РАУС»*, больш ніякіх падрабязнасцяў.

На падставе гэтага аўтар дакумента — **маёр Вайтовіч** — вырашыў правесці агляд дома ў грамадзяніна. Навошта? Там *"могуць быць выяўленыя матэрыяльныя аб'екты, якія маюць значэнне для справы"*.

Мінск

Праваабаронцам паведамілі пра затрыманне ў Мінску **Сяргея Трусава і Івана Зязюлі (1995 год).**

На журналіста канала «Настоящее время» **Рамана Васюковіча** склалі пратакол за працу без акрэдытацыі і сёння будуць судзіць. Журналіста вінавацяць за выхад у прамы эфір праграмы “Главное” 25 чэрвеня, піша @bajby. Сёння журналіста выклікалі ў Першамайскі РУУС Мінска, дзе апыталі з нагоды яго супрацоўніцтва з міжнародным тэлеканалам «Настоящее время». Таксама міліцыянты склалі адміністрацыйны пратакол за парушэнне парадку вырабу і распаўсюду прадукцыі СМІ (арт. 23.5 КаАП).

Суд перанёс пасяджэнне на 14:10 6 ліпеня.

Палітычнага аналітыка **Валерыю Касцюгову** перавялі з ізалятара на Акрэсціна ў СІЗА-1 у Мінску, паведаміла ў фэйсбуку яе дачка. Інфармацыі аб тым, якія падазрэнні або абвінавачвання прад'яўленыя маці, у Анастасіі Касцюговай няма, бо адвакат знаходзіцца пад падпіскай аб неразгалошванні.

> *"Мама цяпер на Валадарцы, мера стрымання арышт. Падпіска аб неразгалошванні, таму пра справу і абвінавачванне нічога невядома, ведае толькі адвакат. Перадачу перадалі,"* — напісала Анастасія Касцюгова.

30 чэрвеня сілавікі правялі пратрус у кватэры Валерыі Касцюговай і затрымалі яе; аналітыка змясцілі ў ізалятар на Акрэсціна. Палітолаг **Павел Усаў** пісаў, што пратрус праводзілі работнікі КДБ, пасля чаго Касцюгову забралі "альбо ў СК, альбо ў КДБ".

Сёння вечарам савет Мінскай гарадской калегіі адвакатаў распачаў у дачыненні да адваката **Дзмітрыя Лаеўскага** дысцыплінарную вытворчасць.

Журналіста і футбаліста **Аляксандра Івуліна** не выпусцілі на волю пасля 30-сутачнага арышту. Ён стаў падазраваным па крымінальнай справе па ч. 1 арт. 342 КК (арганізацыя і падрыхтоўка дзеянняў, якія груба парушаюць грамадзкі парадак, альбо актыўны ўдзел у іх), паведамляе Tribuna.

Яго перавядуць з ІЧУ на Акрэсціна ў СІЗА-1.

Інфармацыя дапаўняецца.

Твитнуть



СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных

Бабруйчаніна будуць судзіць за "публічныя заклікі да арганізацыі мітынгу". Распавядаем, што гэта за артыкул

"Не менш за 100 000 чалавек укрыліся за мяжой". Выйшаў даклад УВКПЧ ААН пра сітуацыю ў Беларусі (дакумент)

WWW.GAZETABY.CO

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў



ГАЛОЎНАЕ

Без зменаў. Адбылася апеляцыя па справе "Вясны"



#ВолюВясне



ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

Заява праваабаронцаў аб прызнанні 11 палітычных зняволеных

Старэйшыну баптысцкай царквы “Новая Зямля” Андрэя Мамойку і яго жонку Веру асудзілі да “хатняй хіміі”

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Шэсць еўрапейскіх парламентарыяў сталі "хроснымі" для беларускіх палітвязняў

Да 20 гадоў калоніі: фігурантам "справы Nexta" запрасілі тэрміны

Затрыманне футбольнага фаната, новы "тэрарыст": хроніка пераследу 21 красавіка (дапоўнена)

Былога ўчастковага асудзілі да 6 гадоў калоніі па справе "Чорнай кнігі Беларусі"

"Не хацелася, каб хтосьці трапляў туды". Экс-палітзняволены Аляксандр Бабко распавёў пра пераслед па "справе цюкоў"

Затрыманні ў Брасце і Віцебску пасля рэйда па сацсетках: хроніка пераследу 20 красавіка

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022

ВЫДАННІ







ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская Інтэрнэт-Бібліятэка

ВЫТОКІ

ADC memorial
Anti-Discrimination Centre

Московская Хельсинкская группа

AMNESTY INTERNATIONAL

СЯБРОЎСТВА

EENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

МІЖНАРОДНЫ КАМІТЭТ ПА РАССЛЕДАВАННІ КАТАВАННЯЎ У БЕЛАРУСІ

Беларуская асацыяцыя журналістаў
baj.by

VOICE OF BELARUS

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY